**Навоша Вікторыя, 41 група**

# АСАБЛІВАСЦІ РАСКРЫЦЦЯ ЧАРНОБЫЛЬСКАЙ ТЭМЫ БЕЛАРУСКІМІ ПРАЗАІКАМІ

*Навук. кіраўн. – Н. В. Заяц, канд. філалаг. навук, дац.*

Чарнобыльская катастрофа падзяліла лёс Беларусі на перыяды: да Чарнобыля і пасля яго. Менавіта такую выснову зрабіў пісьменнік-гуманіст Алесь Адамовіч, які адзначыў, што “новы стан у родзе чалавечым, новы адлік пачаўся з 26 красавіка 1986 года. Да Чарнбыля і пасля Чарнобыля – гэта рознае светаадчуванне, гэта па-новаму небяспечны шлях у будучыню” [Цыт па: 2].

У беларускай літаратуры практычна адразу пасля аварыі на атамнай электрастанцыі з’явілася шмат мастацкіх твораў на тэму Чарнобыля. Першымі на гэтую трагічную падзею нацыянальнай гісторыі адгукнуліся паэты: лірыка як чуйны барометр часу аператыўна рэагуе на жыццё.

Беларуская проза досыць доўга шукала свае шляхі да раскрыцця гэтай тэмы. Аднак пазней свой важкі ўнёсак у асэнсаванне тэмы зрабілі беларускія празаікі. У апавяданнях В. Казько “Сенакос у канцы красавіка”, І. Пташнікава “Львы”, А. Федарэнкі “Бляха”, В. Карамазава “Супраць неба – на зямлі”, аповесці І. Навуменкі “Гасцініца над Прыпяццю”, рамане І. Шамякіна “Злая зорка” і іншых творах уздымаюцца складаныя праблемы, выкліканыя Чарнобылем: бежанства, выгнання з роднай зямлі, страты каранёў і духоўнага апірышча, адказнасці чалавека за прыродна-жывёльны свет. Галоўная ідэя, якая аб’ядноўвае ўсе творы беларускіх пісьменнікаў пра Чарнобыль, – боль пра параненую зямлю, імкненне захаваць на ёй духоўнае і фізічнае жыццё. Побач з агульнымі рысамі кожны канкрэтны мастацкі тэкст мае свае асаблівасці ў раскрыцці названай тэмы.

Напрыклад, у апавяданні І. Пташнікава “Львы” ўздымаецца абумоўленая чарнобыльскай праблема адказнасці чалавека перад светам прыроды – аўтар гаворыць пра згубнае ўздзеянне радыяцыі не толькі на людзей, але і на жывёл. Праз вобраз Джукі пісьменнік яскрава і пераканаўча перадае пакуты жывёльнага свету, усяго прыроднага асяроддзя, паказвае, якія наступствы для навакольнай прыроды можа мець неабачлівая дзейнасць чалавека.

Іншая грань праблемы – страта каранёў і радзімы – даследуецца ў апавяданні В. Карамазава “Супраць неба – на зямлі”. Апавяданне прысвечана падзеям, якія адбыліся пасля Чарнобыля: людзі, вымушаныя пакінуць сваё месца жыхарства, пазбаўляюцца не толькі ўласнага дома, малой радзімы, але і губляюць духоўную сувязь з мінулым. Іншыя ж застаюцца ў апусцелай вёсцы, аднак таксама становяцца выгнаннікамі на атручанай зямлі.

Блізкае паводле ракурсу раскрыцця чарнобыльскай праблемы апавяданне В. Казько “Сенакос у канцы красавіка”. Галоўная тэма – страта беларусамі Радзімы. У апавяданні “Бляха” А. Федарэнка асэнсоўвае трагедыю беларускай нацыі, удымаючы праблему духоўна-нацыянальнага апакаліпсісу, калі быццё беларуса апынулася пад пагрозай разбурэння.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Сваю спецыфіку мае раскрыццё тэмы Чарнобыля ў аповесці І. Навуменкі “Гасцініца над Прыпяццю”. У гэтым творы апавядаецца пра атручаную зямлю, пра запоўненыя хворымі людзьмі бальніцы, пра мёртвыя вёскі, пра змярцвелую Прыпяць. У аповесці ідзе гаворка пра тое, як героі страцілі сваю малую радзіму – хату, дзе нардзіліся яны і іх дзеці, дзе прайшло ўсё іх жыццё. Лейтматыў аповесці – сум па малой радзіме, якую адабраў Чарнобыль. Трагедыя асобнага персанажа пашыраецца да трагедыі агульнанароднай.

Раман І. Шамякіна “Злая зорка” – першае вялікае эпічнае палатно ў беларускай прозе, у якім адлюстраваны Чарнобыль і яго наступствы. Пісьменнік пераканаўча і праўдзіва паказвае першыя дні цяжкіх выпрабаванняў. Расказваючы пра трагедыю двух сем’яў – Пустаходаў і Пыльчанкаў, – пісьменнік гаворыць пра трагедыю беларускага народа ўвогуле. У творы выразна гучыць матыў хлусні, якой тагачасныя саюзныя і мясцовыя ўладары кармілі напалоханых страшнымі чуткамі і прадчуваннямі людзей. “У рамане жудаснай з’явай паўстае сістэма, на рахунку якой пакалечаныя чалавечыя жыцці. Іван Шамякін як пісьменнік-гуманіст пратэстуе супраць сляпога тэхнічнага прагрэсу ў атамны век, супраць антычалавечых эксперыментаў над народам, на якія яго асудзілі бяздумныя кіраўнікі” [1, с. 2].

Такім чынам, сучасныя пісьменнікі з агульным болем, аднак кожны па-свойму, гавораць пра бяду роднай зямлі, трагічны лёс чалавека і народа.

Літаратура


1. Жардзецкая, А. Зямля, параненая Чарнобылем: праблема ўзаемаадносінаў чалавека і прыроды ў творах Віктара Казько, Алеся Кажадуба, Івана Шамякіна / А. Жардзецкая // Роднае слова. – 2003. – № 10. – С. 1–2.
2. Жардзецкая, А. Уся літаратура ў водбліску нябачнага пажару…: адлюстраванне постчарнобыльскай свядомасці ў сучаснай беларускай літаратуры / А. Жардзецкая // Вучоныя запіскі. Серыя мовы і літаратуры. Серыя грамадска-палітычных навук. – 2011. – № 2. – С. 1–7.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ